

## Зіновій ПРЫГОДЗІЧ

* * *

*Ёсць павер'е ў людзей такое:*
*Носяць шчасце буслы з сабою.*

*Дзе ні сядуць яны — заўсёды*
*Між людзьмі будзе радасць, згода.*

*Бо заслоняць буслы любога*
*Ад бяды і ад вока ліхога.*

*Ад пажару, маланкі жахлівай*
*І ад плёткі чужой, зласлівай.*

*Хочуць — кінуць яны калоду*
*Хлебаробам на дождж ці пагоду.*

*Прынясуць радасць маці-татку –*
*Светлавокае немаўлятка.*

*Для дзяцей жа буслы свой клёкат,*
*Як мячы, рассыплюць навокал.*

*Закаханым жа самай шчасліваю*
*Будзе стрэча ля гнязда буслінага.*

### Летнім вечарам

*Вечар крылом ахінуў Целяханы,*
*Зоркі, агні навакол запаліў...*
*Дзесьці ў садах над Агінскім каналам*
*Песні свае завялі салаўі.*

*Коціць канал свае воды паволі,*
*Стаў задуменны за вёскаю бор...*
*Роднае, мілае сэрцу прыволле,*
*Светлым пачуццям шырокі прастор.*

*Вечарам летнім тут добра з каханай*
*Сцежкамі роснымі шчасце шукаць...*
*Ззяюць агнямі наўкол Целяханы,*
*Песні саловак да ранку чуваць.*

### Успамін

*Дождж барабаніць нудна, слотна.*
*Пусты пакой. І я адзін...*
*Але на сэрцы не маркотна —*
*Душу мне саграе ўспамін.*

*Было дажджлівым тое лета,*
*І хмарна, сіверна было.*
*Ды ўспамінаецца не гэта,*
*А стрэч чароўнае святло.*

*Сустрэч кароткіх, хапатлівых...*
*Быў лес гатовы нас схаваць.*
*І мы хаду хвілін шчаслівых*
*Пераставалі заўважаць.*

*Мы забіраліся пад шаты*
*Спагадных сосен і ялін...*
*Хоць дождж лупіў нібы наняты —*
*Надзейным полаг быў галін.*

*Той дождж занадта быў кароткі.*
*Умелі сэрцы ў лад трымцець.*
*І пацалункаў больш салодкіх*
*Мне не даводзілася мець.*

*Ды зразумеў я толькі потым*
*Чароўнасць незабыўных дзён...*
*Хто ведае, з якое слоты*
*Праменьчык будзе нам відзён.*

## Зямля

*У маленстве*
*Была ты казкаю,*
*Сонечнаю, чароўнаю,*
*Таямнічага харасгва і ласкі*
*Поўнаю.*
*А падрос —*
*Зазвінела ў мяне пад нагамі*
*Палянамі гулкімі,*
*Срэбранымі рачулкамі,*
*Шчаслівымі нівамі,*
*Расквечанымі лугамі,*
*Дзе за сонцам я бегаў босы,*
*Абіваючы кветкі, росы.*
*У юнацтве*
*Была задуменна-лірычнаю,*
*Шчодраю, паэтычнаю.*
*Ціхім гоманам мудрых дубоў,*
*Шэптам траў, каласоў*
*Падказала мне*
*Дзівоснейшую таямніцу.*
*Павяла-паказала*
*Сцежкі першай маёй чараўніцы.*
*А цяпер*
*Ты сур'ёзнаю стала больш.*
*Як да сябра*
*Іду да цябе па параду.*
*Ты — мой клопат і боль,*
*Мая радасць.*
*Будуць мераць нястомна*
*Тваю шырыню-даўжыню*
*Мае крокі,*
*Каб тваю цеплыню,*
*Песні-гукі твае,*
*Сонца-фарбы твае*
*Увабраць мне да кроплі.*
*Поўны сіл маладых,*
*Цвёрда, радасна крочу я...*
*О, зямля!*
*Не паверу, што некалі ты*
*Для мяне, праз гады,*
*Станеш проста*
*Сырою і змрочнаю.*

## Напрадвесні

*Халаднаваты месяц люты,*
*Пячэ мароз, што ні кажы.*
*І рэкі лёдам яшчэ скуты,*
*І некрануты снег ляжыць.*

*Ды вось супынішся ў зацішку,*
*Падставіш сонейку свой твар —*
*І п'еш па кроплі, як з кілішка,*
*Цяпла скупога Боскі дар.*

*Зачаравана глянеш: колькі*
*Наўкол прастору і святла!*
*Ялінка вунь свае іголкі*
*Насустрач сонцу падняла...*

*Вярбіна ўзрушылася нечым —*
*Вясновы ўжо, відаць, настрой:*
*Вуаль накінуўшы на плечы, —*
*Яна ў палоне светлых мрой.*

*І ўжо зусім на лад вясенні*
*Гучыць мелодыя ў душы.*
*І грэюць сэрца летуценні...*
*Зіме — канец, што ні кажы!*